**А.М. Нароўская**, *дацэнт*

# ФОРМЫ І КАНТРОЛЬ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ – УДЗЕЛЬНІКАЎ ПАЛЯВЫХ ЭТНАГРАФІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Тэарэтычная частка курса "Этналогія" дае магчымасць студэнтам гуманітарных ВНУ авалодаць навуковай тэрміналогіяй і пазнаёміцца з палажэннямі асноўных этналагічных школ. Аднак аднаго тэарэтычнага курса недастаткова для асэнсавання этнічнай гісторыі. Абстрактныя паняцці напаўняюцца канкрэтным зместам толькі ў жывым этнічным асяроддзі. Магчымасць практычнага прымянення этналагічных ведаў, знаёмства з матэрыяльнай і духоўнай культурай прадстаўнікоў этнасу могуць рэалізавацца ў час самастойнай палявой этнаграфічнай практыкі. Заданні распрацоўваюцца выкладчыкамі кафедры індывідуальна для кожнага ўдзельніка этнаграфічнай практыкі. Яны заключаюцца ў мэтавым даследаванні рэгіянальнай традыцыйнай культуры Беларусі (выяўленне і фіксацыя матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, збор наратыўнага (ад лац. naracio – гаворка), анкетнага і рэчавага матэрыялу, фатаграфаванне, відэазапіс) з наступнай апрацоўкай сабранай інфармацыі. Выбар той ці іншай методыкі палявога даследавання залежыць ад намечаных мэты і задачы. На разглядаемым адукацыйным узроўні можна вылучыць наступныя мэты этналагічнага пазнання: *інфарматыўную* і *камунікатыўную*.

Задачы, якія заключаюцца ў творчым з'яднанні тэорыі і практыкі, даволі складаныя для студэнтаў 2 – 3 курсаў. Асноўная частка работы ў час самастойных экпедыцый павінна быць прысвечана збору наратыўнага матэрыялу. У наратыве праяўляюцца светаўспрыманне этнасу, яго этнічная і культурная спецыфіка. Збор падобнага матэрыялу вельмі неабходны і перспектыўны, паколькі дазваляе выявіць і зафіксаваць рэальную этнічнасць. Акрамя непасрэднага знаёмства студэнтаў са светапоглядамі этнасу на вербальным узроўні, гэта дапаможа пераадолець іх уласныя этнапсіхалагічныя шаблоны і стэрэатыпы.

Вельмі важна навучыць студэнтаў уменню самастойна арыентавацца ў сабранай інфармацыі, уменні канцэнтраваць увагу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на сімвалізме звычайных простых бытавых рэчаў. Прыроднае і культурнае асяроддзе чалавека (элементы ландшафту, часткі жылля, бытавыя прадметы, ежа, адзенне і інш.) заўжды мелі знакавы характар [1, с. 5–11]. Усе гэтыя семіятычныя сродкі разам з моўным матэрыялам, міфамі, музыкай і іншымі з'явамі традыцыйнай культуры валодаюць адзіным і агульным полем значэнняў, магчымасць выяўляць якія даюць студэнтам этнаграфічныя самастойныя экспедыцыі.

Далучэнне студэнтаў да духоўнага свету этнасу – дастаткова складаная задача. Праблема пэўнай адлегласці ў адносінах паміж даследчыкам і прадстаўнікамі этнасу ўзнікае непазбежна, паколькі студэнт-даследчык выступае ў ролі аўтсайдэра, а менавіта ён выключаны з прывычнай жыццёвай прасторы інфарматара. Ад студэнтаў патрабуецца некаторае "ўжыванне" ў жыццёвы працэс этнічнай групы, сумесны з рэспандэнтам удзел у вытворчых і духоўных актах. У дадзеных абставінах можна прымяніць радыяльны прынцып: удзельнікі экспедыцыі могуць рабіць самастойныя папярэдне вызначаныя наведванні ў навакольныя вёскі, спыняючыся стацыянарна ў пэўным месцы (усё гэта ўзгадняецца з навуковым кіраўніком). Прапанаваная методыка грунтуецца на вопыце правядзення палявой этнаграфічнай практыкі сектара этнаграфіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору акадэміі навук і Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, задачай якой было ўключэнне даследчыка ў вывучаемае асяроддзе і ўстанаўленне даверлівых адносін з інфарматарамі. Такі падыход праяўляецца, па-першае, у тактыцы кантакту з насельніцтвам і, па-другое, у арганізацыі побыту этнаграфічнай экспедыцыі.

Студэнтамі набываецца і вопыт сацыяльнай камунікацыі. Ім неабходна мець пэўныя веды этнічнай псіхалогіі. Яшчэ адна праблема заключаецца ў веданні студэнтамі асаблівасцей гаворкі носьбітаў культуры дадзенага рэгіёну, інакш яны рызыкуюць быць незразумелымі ці зразумелымі няправільна. Таму перад выездам у экспедыцыю студэнтам прапануецца самастойна азнаёміцца з літаратурнымі крыніцамі, з якіх яны могуць атрымаць звесткі пра адметнасці мясцовага побыту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жыллё, адзенне, спосаб гаспадарання пры ўсёй сваёй сучаснай уніфікацыі захоўваюць пэўную этнічную спецыфіку, маюць адрозненні ў розных рэгіёнах краіны. Перад этнаграфічным даследаваннем стаіць задача – вызначыць ступень трансфармацыі традыцыйнага побыту, асаблівасці яго захавання. Звяртаецца ўвага перш за ўсё на высокі ўзровень урбанізацыі і індустрыялізацыі сучаснай культуры, інтэнсіўнасць унутранай міграцыі насельніцтва, гэта апошняе асабліва важна. Асобныя рэгіёны і лакальныя арэалы з катастрафічнай хуткасцю губляюць рэшткі традыцыйнай культуры. Выкарыстанне сучасных тэхнічных магчымасцей (фота і відэазапіс) садзейнічае дастаткова поўнай фіксацыі ўзораў традыцыйнай культуры. Асноўным крытэрыем пры вызначэнні каштоўнасці этнаграфічнага помніка павінна быць *тыповасць*. Гэта значыць, што кожны прадмет матэрыяльнай культуры валодае шэрагам асаблівасцей, характэрных для дадзенай мясцовасці.

У сувязі са стварэннем музея народнай творчасці ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў студэнты пад кіраўніцтвам педагога могуць весці актыўную самастойную работу па збіранні, сістэматызацыі і публікаванні матэрыялаў па традыцыйнай абраднасці ў Беларусі.

Пры правядзенні этнаграфічных самастойных даследаванняў звычайна выкарыстоўваецца анкета-апытальнік. Сёння вельмі распаўсюджаным з'яўляецца метад, калі рэспандэнту прапаноўваюцца на выбар некалькі варыянтаў адказу. Такое тэсціраванне, такі метад у этнаграфічным даследаванні можа прывесці да неаб'ектыўных вынікаў, паколькі заведама абмяжоўвае інфарматара і фактычна навязвае яму пажаданы для даследчыка, а часам і памылкова сфармуляваны адказ. На наш погляд, найбольш прымальным, як паказала практыка, з'яўляецца метад свабоднага інтэрв'ю, калі інфарматар можа паведаміць самыя разнастайныя (часам нечаканыя) звесткі, аб чым сведчыць такі феномен чалавечай памяці, якім з'яўляецца стварэнне асацыятыўнага рада [3, с. 395].

Кожны помнік неабходна анатаваць, а менавіта – даць яму кароткае апісанне, якое раскрывае паходжанне і характар, аформіць пашпарт. Калі помнік немагчыма транспартаваць у музей, то пажадана яго сфатаграфаваць або замаляваць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасля заканчэння самастойнай этнаграфічнай практыкі робяцца пісьмовая і вусная справаздачы, арганізуецца дыскусійнае абмеркаванне, у якім удзел бяруць выкладчыкі і студэнты ўсіх пяці курсаў кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства. Дэманструецца на электронных носьбітах матэрыял, які быў сабраны ў экспедыцыі. Гэта садзейнічае перадачы вопыту этнаграфічных самастойных даследаванняў наступным курсам у далейшых пошуках традыцыйнай культуры і побыту.

Такім чынам, этнаграфічная самастойная палявая практыка стварае стымул да аналітычнай работы як у галіне этнаграфічнай навукі, так і ў памежных з ёю – гісторыі, лінгвістыцы, эканоміцы, мастацтвазнаўстве, музыказнаўстве і інш., садзейнічае ўдасканаленню тэхналогіі і методыкі даследаванняў і тым самым аптымізацыі агульнай прафесійнай падрыхтоўкі будучых музейных спецыялістаў.


1. *Лотман, Ю.М.* Несколько мыслей о типологии культуры / Ю.М. Лотман // Языки культуры и проблемы переводимости. – М., 1987.

2. *Этнаграфічныя* экспедыцыі БДМНАП па рэгіёнах Беларусі (1978–1989 гг.).

3. *Выготский, Л.С.* Собрание сочинений. Проблемы общей психологии / Л.С.Выготский. – М., 1982. – Т. 2.

4. *Помнікі* этнаграфіі: методыка выяўлення, апісання і збірання. – Мн., 1981.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Т.Д. Орешко,** *преподаватель*

## СОВРЕМЕННЫЕ ИНФОРМАЦИОННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ КАК СРЕДСТВО ПОВЫШЕНИЯ ЭФФЕКТИВНОСТИ И КАЧЕСТВА УПРАВЛЯЕМОЙ САМОСТОЯТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ

Развитие современного общества напрямую связано с ростом производства, потребления и накопления информации во всех отраслях человеческой деятельности. Информационные потоки в обществе постоянно увеличиваются, происходит формирование